Тэлесеткі

# ФУРГОН, ДЫ НЕ ТОЙ

На АНТ 3 студзеня чакаецца вялікая прэм'ера — серыял «Зялёны фургон». І назва тая ж, як у знакавага дэтэктыва 1983-га, і Харацьян зноў у галоўнай ролі. Але гэта, папярэджваюць стваральнікі, зусім іншая гісторыя. Зняў яе сёлета рэжысёр Сяргей Круцін як працяг папярэдняга «Зялёнага фургона» — «каб не псаваць добры фільм рэмейкам».

Падзеі 6-серыйнага фільма «Зялёны фургон» (другая яго назва — «Стамбульскі») адбываюцца ў Адэсе праз 20 гадоў пасля вядомых падзей, і зусім сталы экс-франтавік Валодзя Патрыкееў працягвае бараць-бу са злачыннасцю. Цяпер ён не наіўны рамантык, а адзінокі воўк з цяжкім лёсам, і справядлівасць для яго набыла зусім іншы сэнс пасля праходжання фронту і лагераў...



Пасляваенную Адэсу здымалі, як ні дзіўна, у Растове-на-Доне і Таганрогу, дзе захавалася нямала будынкаў пачатку XX стагоддзя. Прыкметы сучасней цывілізацыі хавалі пад вінаграднымі лозамі, расстаўлялі водазаборныя калонкі, а старую зброю і тэхніку знайшлі ў калекцыянераў і ў кінакластары «Дон». Сярод галоўных герояў гледачы ўбачаць не толькі Дзмітрыя Харацьяна, але і Кацярыну Дураву (дачка вядомага акцёра Льва Дурава), і знаёмых па серыялах Алега Масленікава-Войтава і Аляксандра Давыдава, і ўзыходзячую зорку Сямёна Трaскунова, і беларуса АнатоляКата, адмоўнае абаянне якога прабіваецца скрозь ўсякі кіношны мундзір.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 84

Як і ў мінулым выпуску, задача для рашэння ***(гл. дыяграму)*** мае блізня: белую пешку а2 трэба пераставіць на b3.



**Белыя:** Кph4, Лh2, пп. a2, c6 (4).
**Чорныя:** Кpc8, пп. c7, h3 (3).
Мат за 3 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, г. Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Расстаноўка фігур у наступнай задачы сімвалізуе навагоднюю ёлку. Заданне — мат у адзін (!) ход, але задача мае пэўны сакрэт.

**Белыя:** Кpd8, Фd7, Сс7, Cd3, Кс5, Ке5 (6).
**Чорныя:** Кpd5, Cd6, пп. d4, e7 (4).

* * *

У сталіцы Эстоніі прайшлі чэмпіянаты Еўропы па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы сярод юнакоў і дзяўчат. У рапідзе залаты медаль заваяваў Дзяніс Лазавік (да 14 гадоў), сярэбраныя — Арцём Сіняўскі (да 14), Ксенія Зелянцова (да 14) і Міхей Навуменка (да 12), бронзавыя — Вячаслаў Зарубіцкі (да 18) і Вольга Бадэлька (да 18). У камандным турніры да 18 гадоў зборная Беларусі атрымала «серабро», а да 14 гадоў дзве нашы каманды занялі адпаведна першае і трэцяе месцы. У бліцы сярэбраныя медалі ў Дзяніса Лазавіка (да 14 гадоў) і Аляксандры Тарасенкі (да 14). У рашэнні задач і эцюдаў Вячаслаў Зарубіцкі заваяваў «золата» ў турніры да 18 гадоў, Арцём Сіняўскі — «серабро» да 14 гадоў. Яшчэ тры медалі на рахунку беларусаў у суперфіналах, якія праводзіліся па алімпійскай сістэме сярод 16 найлепшых удзельнікаў незалежна ад узросту: у юнакоў першы быў Вячаслаў Зарубіцкі, а ў дзяўчат Вольга Бадэлька — другая, Ксенія Зелянцова — трэцяя.

* * *

У Таліне адбыліся і чэмпіянаты Еўропы па рапідзе і бліцы сярод мужчын. У хуткіх шахматах (451 гулец) найлепшыя з 19 беларускіх удзельнікаў былі Аляксей Аляксандраў (16-е месца), Кірыл Ступак (24-е) і Дзяніс Лазавік (40-е). У бліцы (426 удзельнікаў, у тым ліку 16 беларусаў) яны ж занялі адпаведна 21-е, 5-е і 42-е месцы.

* * *

Уладзіслаў Кавалёў выйграў марафон па хуткіх шахматах у эстонскім Пухаярве — 31 бал з 35 магчымых. У ісландскім Сэлфасе Сяргей Жыгалка фінішаваў чацвёртым. Вольга Бадэлька ў польскім Уроцлаве згуляла ў матчы паміж жаночымі камандамі «Зборная свету — зборная Польшчы». А Міхаіл Нікіценка выйграў Мемарыял Васілішына ў Львове.

Вось дзве пераможныя партыі маладога беларускага шахматыста са львоўскага турніра.

Мілан Пачар — Міхаіл Нікіценка. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Кc3 de 4. К:e4 Кd7 5. Кf3 Кgf6 6. К:f6+ К:f6 7.c3 Сe7 8. Cd3 0-0 9. Фe2 b6 10. Cg5 Cb7 11. 0-0-0 c5 12. dc Фc7 13. С:f6 С:f6 14. Лd2 С:f3 15. Ф:f3 Cg5 16. c6 Лac8, 0:1.

Міхаіл Нікіценка — Пётр Сабук. 1. e4 c5 2. Кe2 Кf6 3. Кbc3 d5 4. e5 Кfd7 5. f4 Кc6 6. d4 e6 7. Сe3 Фb6 8. Фd2 a6 9. 0-0-0 Фa5 10. dc К:c5 11. Кd4 К:d4 12. Ф:d4 b5 13. b4 Фa3+ 14. Кpd2 Кa4 15. К:a4 Ф:a4 16. Лb1 a5 17. a3 Cd7 18. Cd3 Сe7 19. g4 Лc8 20. Лb3 0-0 21. Фa7 Сc6 22. Cd4 Cd8 23. Фa6 Сc7 24. Лc3 Cd7 25. Фa7 ab 26. Л:c7 Л:c7 27. Ф:c7 ba 28. Кpe3 b4 29. Фa7 Ф:a7 30. С:a7 Лa8 31. Сc5 a2 32. Лa1 Лa4 33. Кpd2 g6 34. Кpc1, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Лh1! (блізня: 1. Лh2!). Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук, Сяргей Васілевіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Новы год у эфіры



Зімовага надвор'я ў навагоднюю ноч зноў не абяцаюць, але чароўная атмасфера быць павінна. Таму замест снегу беларускія тэлеканалы навыперадкі «адсыпалі» ў святочны эфір камедый, меладрам, тэматычных канцэртаў... На чым варта спыніць увагу, пераключаючы кнопкі пульта?

## Новы год на Макаёнка, 9

Галоўнай разынкай на «Беларусь 1» стане святочнае шоу «Новы год на Макаёнка, 9». Вядучыя вечара — вядомыя па самім шоу «Макаёнка, 9» Яўген Перлін і Андрэй Макаёнак, якія абяцаюць не толькі выступленні артыстаў, але і жарты, гульні, розыгрышы, а таксама торт, аліўе і шмат іншага. У праграму завітаюць вядучыя і з іншых тэлеканалаў медыяхолдынга, каб павіншаваць гледачоў у кампаніі зорных гасцей. А музычныя віншаванні падорыць Алег Скрыпка, Ціма Беларускіх, Дзмітрый Калдун, Naviband, Alekseev, Джо Лін Цёрнер, гурты «Мая Мішэль», «Без білета» і многія іншыя. У 23.50 па традыцыі ў эфіры ўсіх тэлеканалаў — навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. 1 студзеня да святочнага канцэрта «Новы год на Макаёнка, 9» далучацца славутыя блогеры і беларускія спартсмены, а таксама будзе арганізавана караоке з гледачамі.

## Квэст і кінакласіка

«Беларусь 2» пакажа анімацыйныя фільмы, спецвыпускі праграм і камедыі. У прыватнасці, праект «Пін_код» выйдзе ў фармаце навагодняга квэсту. Таксама аўтары праграмы падрыхтавалі спецыяльныя рубрыкі, дзе раскажуць пра этыкет і лайфхакі да свята. А з першых хвілін 1 студзеня кампанію гледачам складзе капітан Джэк Варабей і ўся каманда — у пяці запар фільмах прыгодніцкай сагі «Піраты Карыбскага мора».

## Святочнае меню

У эфіры «Беларусь 3» на працягу дня праграма «Беларуская кухня» пакажа гледачам цікавыя рэцэпты святочных страў: «Мачанка», «Галубцы ў чапцы», «Фаршыраваныя качкі і курыцы». Не абыдзецца і без добрых савецкіх фільмаў, канцэртаў (напрыклад, «Новы год у класічным стылі»). Вечарам у эфір выйдзе святочная праграма «Карагод у Новы год», дзе ў сучасней апрацоўцы прагучаць беларускія народныя песні. Першы фільм, які ўбачаць тэлеаўдыторыя ў новым годзе, будзе кінакарціна «Чарадзеі».

## На новы лад

Менавіта ў такой атмасферы прапануюць правесці час да бою курантаў на тэлеканале АНТ. Гэта будзе не звыклы для гледачоў фармат кштaлту «агеньчыка»: ролямі памяняюцца ўсе — і вядучыя, і артысты. «У нас будзе «новы Новы год», дзе мы ўсё перавярнулі з ног на галаву, але галоўную інтрыгу раскрываць не буду, бо хочацца, каб гледачы ўсё ўбачылі самі», — дзеліцца прэс-сакратар АНТ Ірына Рамбальская. Мы ж толькі ведаем, што тут уся беларуская эстрада апынецца па-за зонай камфорту, а тэлеаўдыторыя будзе здзіўляцца і весяліцца ад душы. Напрыклад, Анатоль Ярмоленка апынецца на аўтобусным прыпынку з ялінкай і мандарынамі, а песні Аляксандра Саладухі новым гучаннем здзівяць нават яго самога.

## «Кватэрнік»

Яго падрыхтавалі на тэлеканале СТБ. Вядучыя і артысты запрашаюць на канцэртную праграму ва ўтульным інтэр'еры і душэўнай кампаніі. У выкананні вядомых артыстаў прагучаць іх самыя папулярныя кампазіцыі і кавер-версіі на тыя песні, якія ўсе мы даўно ведаем, — і ўсё гэта ў суправаджэнні жывога кавер-бэнда. А ў перапынках зорныя госці, сярод якіх Саша Нэма, Ларыса Грыбалёва, Ганна Шаркунова, гурты «Дразды», «Лепрыконсы», Nizkis і многія іншыя, падзеляцца сваімі гісторыямі незвычайных прыгод у Новы год.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота дадзена прэс-службай тэлеканала.**


**Сяброў у новым годзе не мяняюць!**

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка рэкламнай гульні «Звязда» сграваe!», выразайце і дасылайце яе да 12 студзеня 2020-га ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013.

**Сярод падпісчыкаў 17 студзеня 2020 года будуць разыграны сем двухбаковых пледаў з лагатыпам «Звязды» і суперпрыз — КАВАВАРКА эспрэса Vitek.** Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 27 студзеня 2020 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2020 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак — (017) 263 66 73.**

Правілы рэкламнай гульні чытайце ў нумары «Звязды» за 30 лістапада.

Тэрмін правядзення гульні — з 1 снежня 2019 года да 31 сакавіка 2020 года.



Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3694 ад 26.11.2019, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2020 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)
______ **на I квартал або I паўгоддзе 2020 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ________ (індэкс) ________

______________________

______________________

**Удачы ў розыгрышы!**